***Выдатную традыцыю прывіваюць першакурснікам Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа. Іх шлях да педагагічнай вяршыні пачынаецца са свята чытацкага білета ў бібліятэку. А на гэты раз першакурснікам каледжа пашчасціла яшчэ больш. Навучэнцы атрымалі чытацкія білеты ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі.***

# Чытацкі білет адкрывае свет

Сёння Нацыянальная бібліятэка нашай краіны — гэта не толькі брэнд нашай сталіцы, уражлівая славутасць Мінска, але і найважнейшы адукацыйны і асветніцкі цэнтр, скарбніца тысяч кніг, велізарная пляцоўка для ўдзельнікаў шматлікіх сустрэч. З вітальным словам да навучэнцаў Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа звярнулася першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі А.Е.Даўгаполава. Яна адзначыла, што без здольнасці ўдумліва ўспрымаць напісанае ў кнігах педагог не зможа прывіць гэтае ўменне сваім выхаванцам.

Кажуць, што каб стаць разумным, дастаткова прачытаць 10 кніг, але, каб знайсці іх, трэба прачытаць тысячы. Такім чынам, навучэнцы каледжа, атрымаўшы гэтыя чытацкія білеты, змогуць прачытаць тысячы кніг і знайсці тыя 10, якія зробяць іх мудрымі выхавальнікамі і настаўнікамі, адзначыла прадстаўнік Нацыянальнай бібліятэкі.

Над самым уваходам у Нацыянальную бібліятэку на 19 мовах можна прачытаць фразу з Бібліі, выдадзенай у свой час Францыскам Скарынам. На беларускай мове яна гучыць так: “Каб быў дасканалым Божы чалавек”. А што можа дапамагчы яму ў гэтым? Вядома, кніга. Кніга раскажа, дапаможа, навучыць! Кніга здольна ўдасканальваць веды. Безумоўна, самая галоўная кніга, з якой пачынаецца шлях чалавека да ведаў, шлях да дасканаласці, — гэта Буквар!

Разам з чытацкімі білетамі будучыя педагогі атрымалі яшчэ адзін падарунак — сустрэчу з чалавекам, які ведае пра буквар усё. Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Аляксандр Суша правёў лекцыю “Спачатку Аз ды Букі”, дзякуючы якой выкладчыкі і навучэнцы каледжа даведаліся пра 400-ю гісторыю Буквара.

Дырэктар Мінскага гарадскога педагагічнага каледжа кандыдат педагагічных навук Кацярына Аляксандраўна Пятруцкая выказала надзею на далейшае плённае супрацоўніцтва галоўнай бібліятэкі краіны і педагагічнай установы, падзякавала калектыву бібліятэкі за сустрэчу з Кнігай і за магчымасць дакрануцца да вечнасці.

**Падрыхтавала**
**Ала КЛЮЙКО.**
*kliuiko@ng-press.by*